**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

УДК 821.161.3.09-1(043.3)

**АНЦІМОНІК**
Анастасія Віктараўна

# БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ КАНЦА XX – ПАЧАТКУ XXI СТСТ.: МАСТАЦКАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ЭКЗІСТЭНЦЫЙНАЙ ПРАБЛЕМАТЫКІ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Мінск, 2022

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік — **Сінькова Людміла Дзмітрыеўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Афіцыйныя апаненты: **Тарасава Тамара Мікалаеўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры беларускай і замежнай літаратуры УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**Барысенка Вольга Уладзіміраўна,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

Апаніруючая арганізацыя — УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»

Абарона адбудзецца 16 верасня 2022 г. у 12.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара: 378-63-78).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы 30 чэрвеня 2022 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый М. М. Хмяльніцкі

# УВОДЗІНЫ

Цікавасць да анталагічных пытанняў налічвае некалькі тысячагоддзяў існавання і развіцця – задоўга да афармлення філасофіі экзістэнцыялізму чалавек асэнсавана спасцігаў сябе (прынцып, сфармуляваны ў антычнасці, *Nosce te ipsum*). Комплекс так званых адвечных пытанняў уключае ў сябе і экзістэнцыйныя праблемы і матывы. Да іх ліку адносяць праблемы пошукаў сэнсу жыцця, кахання, смерці, свабоды, абсурднасці свету, неабходнасці выбару, а таксама драматычнага светаўспрымання: са страхам, вінsocialой, трывогай і пакутамі. Экзістэнцыйныя пытанні, выклікаючы заўсёдную ўвагу ў чалавека, не маюць адназначнага адказу і застаюцца адкрытымі, набываюць на кожным этапе культурнага развіцця адрозную інтэрпрэтацыю. Уваходзячы ў поле філасофіі як навукі, экзістэнцыйнае светаразуменне звязана і з вывучэннем псіхалогіі і іншых сістэм ведаў, у якіх таксама аналізуецца ўнутраны свет асобы ў соцыуме.

Экзістэнцыйныя матывы асэнсоўваліся як непасрэдна філосафамі-экзістэнцыялістамі (Ж.-П. Сартрам, А. Камю, М. Хайдэгерам, К. Ясперсам, М. Бярдзяевым і інш.), так і большасцю мысляроў і даследчыкаў розных часоў, сярод якіх мэтазгодна згадаць С. К’еркегора, А. Шапэнгаўэра, Ф. Ніцшэ, Э. Фрома, Т. Гобса, М. Шэлера, а таксама псіхолагаў і псіхатэрапеўтаў І. Ялома, Р. Мэя, Л. Бінсваргена, інш. Вывучэнню праяў філасофіі экзістэнцыялізму непасрэдна ў мастацкай літаратуры XX ст. адводзіцца галоўная роля ў наступных працах: «Экзістэнцыялізм у філасофіі і літаратуры» Е. Косака (пер. з пол.; Масква, 1980); «Экзістэнцыялізм і сучасны амерыканскі раман» Т. Дзянісавай (Кіеў, 1985); «Этыка кахання і метафізіка свавольніцтва» Ю. Давыдава (Масква, 1989); «Экзістэнцыйная традыцыя ў рускай літаратуры XX стагоддзя. Дыялогі на мяжы стагоддзяў» В. Заманскай (Масква, 2002); «Беларуская проза XX стагоддзя ў еўрапейскім літаратурным кантэксце: экзістэнцыялізацыя духоўнага свету героя» Т. Тарасавай (Мінск, 2013).

Работы, прысвечаныя агляду сучаснай беларускай лірыкі ў цэлым, у беларускім літаратуразнаўстве з’яўляюцца рэгулярна: гэта кнігі У. Гніламёдава «Ад даўніны да сучаснасці» (Мінск, 2001), А. Бельскага «Сучасная беларуская літаратура» (Мінск, 1997), «Краса і смутак» (Мінск, 2000), «Сучасная літаратура Беларусі» (Мінск, 2000), «Галасы і вобразы» (Мінск, 2008), В. Русілка «Сучасная беларуская паэзія: творчыя індывідуальнасці» (Віцебск, 2005), С. Калядка «Беларуская сучасная жаночая паэзія: мастацкія канцэпцыі «жаночага» шчасця» (Мінск, 2010), «“Жаночае” і “мужчынскае” пісьмо ў сучаснай беларускай паэзіі» (Мінск, 2017), «Літаратуразнаўчая тэорыя паэтычнай эмоцыі» (Мінск, 2018)[1], І. Шматковай «Беларуская жаночая паэзія другой паловы XX стагоддзя» (2017).

---

[1] С. Калядка – аўтарка артыкула «Экзістэнцыяльныя праблемы ў беларускай паэзіі» (2011). Аб’ектам даследавання тут сталі выбраныя праявы экзістэнцыялізму як напрамку філасофіі ў паэзіі Я. Купалы, А. Вярцінскага, Н. Мацяш, В. Шніпа, Т. Бондар, Я. Янішчыц і некаторых інш.

Паэзіі моладзі з мяжы 1990-х – 2000-х гг. прысвечаны манаграфіі А. Бязлепкінай «Разам і паасобку: Таварыства «Тутэйшыя»: Гісторыя, асобы, жанры» (Мінск, 2003); А. Брадзіхінай «Сучасная беларуская інтымная лірыка: тэндэнцыі і перспектывы развіцця» (Гомель, 2009); К. Бартноўскай (Katarzyna Bortnowska) «Białoruski postmodernizm: Liryka «pokolenia Bum-Bam-Litu»« (Варшава, 2009); А. Макміліна «Writing in a cold climate: belarusian literature from the 1970s to the present day» (Лондан, 2010), «Рунь: Маладыя беларускія паэты пачатку XXI стагоддзя» (Мінск, 2016); І. Скарапанавай «Поставангардызм Віктара Жыбуля» (Мінск, 2018)[2]; А. Бараноўскага «Сучасная беларуская філасофская лірыка: праблематыка, вобразнасць, стыль» (аўтарэферат кандыдацкай дысертацыі, Мінск, 2019).

У працах з галіны беларускай літаратурнай крытыкі таксама аналізуецца сучасная паэзія: вылучым выданні Г. Кісліцынай «Blonde attack» (Мінск, 2003), «Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы» (Мінск, 2006), «Культурны градыент: ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX–XXI стагоддзяў» (Мінск, 2015); А. Бязлепкінай «100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру» (Мінск, 2012); В. Акудовіча «Разбурыць Парыж» (2004); І. Шаўляковай «Рэстаўрацыя шчырасці» (Мінск, 2005),»Сапраўдныя хронікі Поўні» (Мінск, 2011); Л. Сільновай «Крышталёвы сад» (Мінск, 2007); С. Дубаўца «Вершы» (Мінск, 2007); Л. Алейнік «Пясочны гадзіннік» (Мінск, 2010); Л. Галубовіча «Сыс і кулуары» (Мінск, 2010).

Разам з тым, аналіз названых прац, у той ці іншай ступені адпаведных тэме дысертацыі, дазволіў зрабіць наступную выснову: праблемы і матывы з экзістэнцыйнымі канатацыямі і іх увасабленне ў беларускай паэзіі пачатку XXI стагоддзя яшчэ не станавіліся элімінаваным, самастойным прадметам комплекснай увагі ў навуковых даследаваннях.

**Актуальнасць** дысертацыйнай працы, такім чынам, вызначаецца:

1) запатрабаванасцю абнаўлення ведаў пра нацыянальна-спецыфічны і камунікатыўны патэнцыял сучаснай беларускай паэзіі з выяўленымі экзістэнцыйнымі вобразамі і светаадчуваннем, ролю яе набыткаў у літаратурным працэсе як Беларусі, так і замежных краін;

2) наспеласцю абнаўлення праяў мастацкага мыслення сучасных беларускіх паэтаў, актыўных на пераходзе з XX у XXI стст., у анталагічным ракурсе: з трактоўкамі праблем дзейснага і метафізічнага быцця, грамадскага і асабістага жыцця, фізічнай і духоўнай смерці;

3) неабходнасцю выяўлення характарыстык лірычнага суб’екта ў беларускай паэзіі экзістэнцыйнай скіраванасці, прадстаўленай аўтарамі з трох пакаленняў, чыя творчасць адпавядае тэндэнцыям чарговай пераломнай эпохі з яе «чалавекам памежжа».

---

[2] Гл. таксама навуковыя артыкулы І.С. Скарапанавай: «Теоретик белорусского поставангардизма: Юрась Борисевич» (2010), «Канцэптуалісцкія праекты Віктара Іванова» (2010), «Ироничный маскарад: В. Бурлак» (2010), «Функцыя інтэртэкстуальнасці ў творах Андрэя Хадановіча» (2012); «Друкапісы Зміцера Вішнёва» (2012), «Калядныя вершы Андрэя Хадановіча» (2013), «“Минская школа” на рубеже XX–XXI вв.» (2016).

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі.**

Даследаванне праведзена ў межах навуковай тэмы кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ «Беларуская літаратура XI – XIX стст. у міжкультурнай камунікацыі еўрапейскіх літаратур» (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, № дзяржрэгістрацыі 20162486, тэрмін выканання 2016 – 2020).

**Мэта і задачы даследавання.**

**Мэта** дысертацыйнага даследавання – вызначыць мастацкія падыходы да рэалізацыі экзістэнцыйных праблем у паэзіі адметных і адрозных па ідыястылях творцаў з трох пакаленняў, актыўных на мяжы XX – XXI стст. (з канца 1980-х да 2010-х гг.), і на гэтай падставе рэканструяваць светаадчуванне і светапоглядныя арыенціры беларуса-інтэлектуала ў постсавецкі час.

Для дасягнення названай мэты былі пастаўлены наступныя **задачы**:

- вызначыць спецыфіку матываў з экзістэнцыйнымі канатацыямі як адметнага прадмета літаратуразнаўчага даследавання; вылучыць адрозненне паміж такімі паняццямі, як *лірыка з апеляцыяй да філасофіі экзістэнцыялізму і лірыка з экзістэнцыйным светаадчуваннем, матывы з экзістэнцыйнымі канатацыямі*;
- вылучыць і ахарактарызаваць мастацкія выявы апазіцыі *жыццё – смерць*, тэмы сыходу з жыцця ў лірыцы беларускіх паэтаў з трох пакаленняў, актыўных на памежжы XX – XXI стст.;
- выявіць сэнсавыя канатацыі матываў, звязаных з раскрыццём у лірыцы тэм адзіноты, месца асобы ў свеце, свабоды, сэнсу жыцця, з улікам сацыяльных і эстэтычных перадумоў для станаўлення ідыястыляў у вершах беларускіх аўтараў з савецкага і першага постсавецкага пакаленняў;
- вызначыць і сістэматызаваць матывы з экзістэнцыйнымі канатацыямі ў лірыцы на тэму кахання беларускіх паэтаў мяжы XX – XXI стст.;
- стварыць комплексную характарыстыку матываў з экзістэнцыйнымі канатацыямі, што былі вылучаны ў той сучаснай беларускай лірыцы, якая знаходзіцца ў карэлятыўных адносінах з філасофіяй экзістэнцыялізму і метафізічнай паэзіяй, з'яўляючыся асобным лірычным дыскурсам.

**Аб'ект і прадмет даследавання.**

**Аб'ектам** даследавання з'яўляецца лірыка, у якой вылучаюцца матывы, вобразы, сюжэты з экзістэнцыйнымі канатацыямі, створаная прадстаўнікамі трох беларускіх паэтычных генерацый, актыўных у канцы XX і пачатку XXI стст.: старэйшай – з такімі выбітнымі творцамі, як Р. Баравікова, А. Вярцінскі, Н. Мацяш, А. Разанаў, Я. Сіпакоў і М. Стральцоў; сярэдняй – І. Бабкоў, Г. Дубянецкая, А. Мінкін, Л. Рублеўская, Л. Сом, А. Сыс, В. Шніп; маладзейшай – Ц. Велет, З. Вішнёў, В. Гапеева, А. Дуброўскі-Сарочанкаў, В. Жыбуль, Н. Кудасава, М. Латышкевіч, В. Морт, А. Рудак, В. Рыжкоў, В. Трэнас. Мастацкія тэксты, выкарыстаныя ў дысертацыі, абмежаваны

перыядам да глабальнай пандэміі каронавіруса COVID–19, пасля якога светаадчуванне сучасніка рэзка змянілася і мае патрэбу ў асобным вывучэнні.

**Прадмет** даследавання – матывы, вобразы, сюжэты з экзістэнцыйнымі канатацыямі ў прэзентатыўных тэкстах сучаснай беларускай паэзіі.

**Навуковая навізна даследавання.**

У дадзеным даследаванні **ўпершыню** ў беларускім літаратуразнаўстве:

- распрацавана тэарэтычная аснова для вылучэння і аналізу праблем з экзістэнцыйнай прыродай у рэпрэзентатыўных тэкстах сучаснай беларускай лірыкі;
- рэканструявана рознавектарнасць экзістэнцыйнага светаадчування ў паэтычным сегменце нацыянальнага літаратурнага працэсу на мяжы XX – XXI стст.;
- дэталёва ўзноўлены і ахарактарызаваны вобразны палілог паміж трыма пакаленнямі паэтаў, што прадстаўляюць адрозны быційны вопыт беларуса-сучасніка.

Навуковая значнасць вынікаў, атрыманых у дысертацыі, заключаецца ў тым, што выкананая праца мае інтэгратыўны характар: яна праведзена на памежжы з філасофіяй, улічвае мастацкія прыярытэты трох адрозных паэтычных генерацый на сыходзе XX – пачатку XXI стст. Гэта дазволіла раскрыць палілог у экзістэнцыйным полі прадстаўнікоў розных пакаленняў творцаў і звязаць навацыі ў беларускай літаратуры (звароты да паэтыкі постмадэрнізму, поставангардызму) з нацыянальнай культурнай глебай. Творчасць даследаваных аўтараў у такім ракурсе ў беларускім літаратуразнаўстве паслядоўна і цэласна актуалізавана ўпершыню.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

**1.** Матывы з экзістэнцыйнымі канатацыямі вылучаюцца на памежжы мастацкай вобразнасці і аднаго з філасофскіх напрамкаў – экзістэнцыялізму. У літаратуразнаўчым даследаванні неабходна адрозніваць ужыванне тэрмінаў *«экзістэнцыяльны», або «экзістэнцыялісцкі»* (знітаваны з канкрэтнымі пастулатамі філасофіі экзістэнцыялізму), і *«экзістэнцыйны»* (непасрэдна звязаны з праблемамі адзінкавага чалавечага жыцця, што асэнсоўваюцца паэтамі розных эпох, розных эстэтычных і светапоглядных прыхільнасцей). У сувязі з тым, што названыя тэрміны маюць нятоеснае сэнсавае напаўненне, у дысертацыйным даследаванні вылучаюцца дзве разнавіднасці экзістэнцыйна скіраванай сучаснай лірыкі, у якой асэнсоўваюцца феномены жыцця і смерці, самагубства, кахання, выбару, адзіноты, інш. Па-першае, гэта творы самай рознай тэматыкі і стылістыкі, у якіх сустракаюцца вобразы з экзістэнцыйнымі канатацыямі, і, па-другое, творы з інтэлектуальным, цэласным экзістэнцыйным светаадчуваннем, выразна набліжаныя да філасофскага дыскурсу – да пастулатаў экзістэнцыялізму. Асноўны акцэнт у дысертацыі зроблены на вывучэнні вершаваных тэкстаў першай разнавіднасці, паколькі яны з'яўляюцца больш распаўсюджанымі ў беларускай літаратурнай традыцыі XX – пачатку XXI стст.

**2.** Важнейшай праблемай у лірыцы на мяжы XX – XXI стст. з’яўляецца асэнсаванне тэмы сыходу з жыцця. Усе тры генерацыі сучасных паэтаў усведамляюць праблему смерці альбо як дадзенасць, альбо праз адмаўленне і ірацыянальны страх перад нябытам. Старэйшае пакаленне ўспрымае смерць праз вопыт разумення маральнай, гуманістычнай нормы, што нярэдка выказваецца ў дыдактычнай манеры; смерць мысліцца толькі ў сувязі з жыццём як важнейшай каштоўнасцю: у лірыцы Р. Баравіковай, А. Вярцінскага, Н. Мацяш, А. Разанава, Я. Сіпакова, М. Стральцова. У вершах пераважнай большасці паэтаў наступнага пакалення («васьмідзясятнікаў») скон нярэдка набывае пазітыўныя канатацыі, успрымаецца менш разбуральным, чым здрада, страх ці само чалавечае існаванне, а карэляцыя «жыццё – смерць» губляе сваю антытэтычную сутнасць, замяняючыся каўзуальнай сувяззю. Так, фаталізм у стаўленні да смерці выразна выказаны ў вершах І. Бабкова, Г. Дубянецкай, А. Мінкіна, Л. Рублеўскай, Л. Сом, А. Сыса, В. Шніпа. У лірыцы названых аўтараў скон захоўвае свой трагізм толькі ў выпадку незваротнай страты блізкага чалавека. Паэты «трэцяга пакалення», якія пачыналі пісаць у 1990-я гг., значна часцей за старэйшых паплечнікаў звяртаюцца да праблемы смерці. Яны падкрэсліваюць абыякавую рэакцыю на сыход з жыцця ў сваіх персанажаў, адсутнасць страху, эпатаж у дачыненні да фактаў скону, што пацвярджаецца аналізам творчасці Ц. Велета, З. Вішнёва, В. Гапеевай, А. Дуброўскага-Сарочанкава, В. Жыбуля, Н. Кудасавай, В. Морт, А. Рудака, В. Рыжкова, В. Трэнас, іншых. Для іх паэзіі характэрна ўзмоцненая ўвага да тэмы суіцыду: праз пражыванне лірычнымі персанажамі шырокага спектру эмоцый, датычных самагубства.

**3.** Важнейшыя матывы з экзістэнцыйнымі канатацыямі гучаць у вершах на тэму адзіноты сучаснага чалавека. Паэты ўсіх трох пакаленняў раскрываюць гэтую тэму праз выявы тэатралізацыі жыцця, фальшу, гульні і падобнага. У рэфлексійна-медытатыўных тэкстах старэйшай генерацыі вядучымі робяцца тэмы сумнення, немагчымасці самаспазнання, што з асаблівай выразнасцю вылучаецца ў лірыцы Р. Баравіковай, Н. Мацяш, А. Разанава. У лірыцы пакалення «васьмідзясятнікаў» самым важным выступае не столькі пошук сябе сярод іншых, колькі вырашэнне праблемы ўнутранай свабоды. Яна, у сваю чаргу, часта злітавана з эмоцыямі страху (прычым бояззю як страты волі, так і яе набыцця), застаючыся неспасціжным феноменам у вершах Г. Дубянецкай, Л. Рублеўскай, Л. Сом, А. Сыса, В. Шніпа. Сучасныя аўтары «трэцяга пакалення» асэнсоўваюць экзістэнцыйныя праблемы спасціжэння сябе і навакольнага свету праз канфліктнае супрацьстаянне «Я–Соцыум», якое вылучаецца сваёй катэгарычнасцю і невырашальнасцю на фоне вопыту папярэднікаў. Адсюль такія абарончыя рэакцыі, як скепсіс і іронія, агрэсія, эскапізм, культываванне і эстэтызацыя болю, пакутаў і адзіноты, чым асабліва вызначаюцца вершы В. Гапеевай, А. Дуброўскага-Сарочанкава, Н. Кудасавай, М. Латышкевіч, В. Морт, А. Рудака, В. Трэнас.

**4.** Адно з галоўных месцаў у мастацкай аксіялогіі ўсіх генерацый сучасных паэтаў займае пачуццё кахання. Спецыфіка экзістэнцыйных канатацый у вершах з матывамі гэтага пачуцця вынікае з эратычна-танатычнай прыроды любові. Паэтамі сярэдняга пакалення разбуральны патэнцыял кахання асэнсоўваецца часцей, чым прадстаўнікамі іншых генерацый, і інтэрпрэтуецца як магчымасць знакавага самавыяўлення для асобы: у вершах І. Бабкова, Г. Дубянецкай, Л. Рублеўскай, Л. Сом, інш. Адметна, што калі драматычны модус мастацкасці ў паэтаў-паплечнікаў са старэйшага і сярэдняга пакаленняў характэрны пераважна для жаночай любоўнай лірыкі – страх, рэўнасць, адзінота, пакуты гераінь Р. Баравіковай, Н. Мацяш, Г. Дубянецкай, – то ў маладзейшай генерацыі ён уласцівы таксама і мужчынам у значнай ступені. Віталісцкі пачатак нярэдка саступае мартальнаму, паэтычнае выказванне набывае гранічную эгацэнтрычнасць, эпатажнасць у вершах з матывамі кахання З. Вішнёва, В. Гапеевай, Н. Кудасавай, В. Морт, В. Рыжкова.

**5.** Палілог беларускіх паэтаў з розных генерацый пацвярджае інтэлектуальную насычанасць і варыянтнасць эмацыйных інтэнцый у распрацоўцы экзістэнцыйнай праблематыкі. Тэкставы аналіз пацвярджае, што інтэлектуальны экзістэнцыйны складнік сістэмна, як выразная ўласцівасць светапогляду і ўсвядомленая тэндэнцыя, пазіцыяваны ў лірыцы асобных паэтаў старэйшага і сярэдняга пакалення: М. Стральцова, І. Бабкова, А. Мінкіна, В. Трэнас. У лірыцы гэтых аўтараў прасочваецца цэласны філасофскі дыскурс. Разам з тым большасць беларускіх паэтаў выяўляюць дастаткова збалансаваны светапогляд, у якім апеляцыя да філасофіі экзістэнцыялізму фіксуецца толькі на ўзроўні асобных матываў і вобразаў з адпаведнымі канатацыямі.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені.**

Вынікі дысертацыйнага даследавання атрыманы аўтарам самастойна, надрукаваныя артыкулы напісаны таксама самастойна, без сааўтараў.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў.**

Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання прайшлі публічную апрабацыю ў якасці дакладаў на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: XLIII студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя «Дні студэнцкай навукі» (Гомель, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, 24–25 красавіка 2014 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных «VIII Машэраўскія чытанні» (Віцебск, Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. Машэрава, 16–17 кастрычніка 2014 г.); Студэнцкая навуковая канферэнцыя філалагічнага факультэта УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны» (Гомель, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, 16 красавіка 2015 г.); VI Міжнародная навуковая канферэнцыя «Скарына і наш час» (Гомель, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, 6 лістапада 2015 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблема вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час» (Гомель, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя

Ф. Скарыны, 20 мая 2016 г.); XLVI студэнцкая навуковая канферэнцыя «Актуальныя праблемы мовазнаўства і літаратуразнаўства» (Гомель, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, 20 красавіка 2017 г.); XI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя выкладчыкаў, аспірантаў, магістрантаў, студэнтаў (Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 22 лістапада 2017 г.); V Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя маладых навукоўцаў «Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання» (Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 22 сакавіка 2019 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Гуманітарная прастора горада і рэгіёна» (Украіна, Адэса, Адэскі нацыянальны ўніверсітэт імя І. І. Мечнікава пры ўдзеле Інстытута мовазнаўства імя А. А. Патабні НАН Украіны, 16–17 кастрычніка 2019 г.); 76-я навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў філалагічнага факультэта БДУ (Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 24 красавіка 2019 г.); 77-я навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў БДУ (Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 11–22 мая 2020 г.); 78-я навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў філалагічнага факультэта БДУ (Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 22 красавіка 2021 г.). Агульная колькасць канферэнцый – 12.

Пра выкарыстанне вынікаў працы сведчыць *Акт аб укараненні вынікаў НДОКР у вучэбны працэс* (распрацоўка «Спецыфіка вырашэння экзістэнцыйных праблем у беларускай лірыцы мяжы тысячагоддзяў», выкананая па тэме НДР «Наватарскія тэндэнцыі ў сучаснай беларускай літаратуры» (ГБ-16-13), № 1 ад 31.08.2017г.)

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.**

Па тэме дысертацыі апублікавана 25 прац, у тым ліку 4 артыкулы ў навуковых крыніцах, рэкамендаваных ВАК Беларусі (аб’ём – 1,56 аўтарскага ліста), 1 артыкул у замежным выданні (аб’ём – 0,46 аўтарскага ліста), 13 – у зборніках навуковых артыкулаў, 7 – у зборніках матэрыялаў і тэзісаў навуковых канферэнцый.

**Структура і аб’ём дысертацыі**. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу (166 адзінак, з іх спіс выкарыстаных крыніц змяшчае 141 адзінкі, спіс публікацый саіскальніка – 25 адзінак). Агульны аб’ём дысертацыі – 119 с., асноўны тэкст займае 107 с., спіс літаратуры – 12 с.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ПРАЦЫ

**У першай главе** **«Экзістэнцыйнае светаразуменне як прадмет літаратуразнаўчага даследавання»** разглядаюцца тэарэтычныя пытанні, звязаныя з тэмай дысертацыі.

**У раздзеле 1.1 «Экзістэнцыя і экзістэнцыялізм у філасофскім дыскурсе»** адзначаецца, што экзістэнцыйная праблематыка (якая ўключае развагі пра сэнс жыцця, праявы драматычнага светаўспрымання (смерць, страх, адзіноту), феномены свабоды, кахання, спасціжэнне ўласнага «Я» і да т.п.) у

межах корпуса так званых адвечных пытанняў разглядаецца ў даследаванні найперш праз узаемасувязь уласна літаратуразнаўчага падыходу і філасофскага базісу. Даецца характарыстыка аднаго з пануючых у XX стагоддзі філасофскіх напрамкаў – экзістэнцыялізму. Робіцца акцэнт на ўласцівых гэтаму кірунку паняццях «памежнай сітуацыі» / «памежнага стану», на тым, што літаратура «памежжа» часцей за сукупнасць мастацкіх тэкстаў іншых культурных перыядаў звяртаецца да экзістэнцыйных праблем. Тлумачыцца цэнтральная катэгорыя напрамку – экзістэнцыя. Прыводзіцца размежаванне гранічна важных для абранай тэмы дэфініцый – «экзістэнцыйны» і «экзістэнцыяльны», што маюць living рознае сэнсавае напаўненне. Падкрэсліваецца, што ў дысертацыі акцэнт робіцца на тэрміне «экзістэнцыйны» (вытворнае ад слова «экзістэнцыя»), якое выражае ўсё тое, што знітавана з канкрэтным быццём, з цяжкавырашальнымі пытаннямі чалавечага існавання.

**У раздзеле 1.2 «Асноўныя феномены і матывы з экзістэнцыйнай канатацыяй у мастацкай літаратуры»** акрэсліваюцца асноўныя па-мастацку асэнсаваныя эстэтычна-філасофскія катэгорыі, якія ўбіраюць у сябе найбольш вострыя і ўразлівыя праявы чалавечага існавання, а таксама характарызуюцца галоўныя літаратуразнаўчыя і філасофскія працы, у якіх асэнсоўваюцца разглядаемыя феномены. А непасрэдна: феномен смерці як самая неспазнавальная і стрэсавая «памежная сітуацыя», праблема самагубства, пытанне сэнсу быцця і жыцця, катэгорыя свабоды, адзінота як матыў з экзістэнцыйнай канатацыяй, феномен кахання. Падкрэсліваецца, што ў дысертацыі кола выбраных мастацкіх тэкстаў складаецца найперш з узораў рэфлексіўнай (інтэлектуальнай, медытатыўнай) і інтымнай лірыкі – лірыкі з экзістэнцыйнымі канатацыямі.

**<u>Глава 2</u> «Адметнасці ўвасаблення матываў з экзістэнцыйнымі канатацыямі ў паэзіі сучасных творцаў старэйшага пакалення»** прысвечана феноменам жыцця і смерці, праблеме пошуку сэнсу жыцця і феномену кахання, рэалізаваным у сучаснай лірычнай творчасці Р. Баравіковай, А. Вярцінскага, Н. Мацяш, А. Разанава, Я. Сіпакова і М. Стральцова.

**У раздзеле 2.1 «Рэалізацыя мастацкай дыхатаміі “жыццё – смерць”»** адзначаецца, што паэзія прадстаўнікоў старэйшай генерацыі вылучаецца сярод іншых найперш сваёй вітальнасцю, трывалай верай у перамогу жыцця над смерцю і абсурднасцю свету. Жыццесцвярджальны пафас аказваецца дамінантным у лірыцы А. Вярцінскага («Сярод вялізнай, на ўвесь свет, вайны…», «Жыву!»), Н. Мацяш («Тая ўсмешка», «Свяціся!»), Я. Сіпакова («Ляціць Зямля – наш карабель касмічны…», «Адзін аднаго крыўдзілі порадзь…»), у ранняга М. Стральцова («Шчаслівая хвіліна», «Неспадзяванкі чакаеш...», «Ускраіна абвалаклася дымам…») і інш. Увага надаецца рэпрэзентацыі антымілітарысцкіх матываў. Жыццё ў аўтарскай творчасці разглядаецца як самая вялікая каштоўнасць (гэтая думка можа набываць дыдактычны характар у традыцыях сацыялістычнага рэалізму) і нярэдка паўстае як сэнсаўтваральны вобраз. Часам рэфлексіі на тэму ўласнага існавання

прыводзяць лірычных герояў да тэмы рэінкарнацыі (А. Разанаў «Атава», «Дарожныя знакі»). Спецыфіка вырашэння экзістэнцыйнага пытання смерці мае, як правіла, два палярна адрозныя вектары. З аднаго боку, лірычныя героі стаічна ўспрымаюць непазбежнасць смерці і ўсведамляюць яе непарыўнасць з жыццём, з другога – драму немагчымасці абмінуць скон паэты пераважна вытлумачваюць падсвядомым ірацыянальным страхам перад ім. Адметна, што ў лірыцы не акрэсліваецца карэляцыя паміж паняццямі «жыццё» і «існаванне», назіраецца мінімальная колькасць згадак самога слова «смерць». Асэнсаванне з’явы памірання адбываецца праз зварот да вобразаў небыцця, нізу, долу, дна, сну, непрытомнасці, беззваротнасці, выйсця, пераходу, лютасці, ліха, бязлітаснасці, восені, вечара, чэрапа, прорвы.

**Раздзел 2.2 «Пошук сэнсу жыцця і спасціжэнне ўласнага “Я” ў рэаліях варожага свету»** прысвечаны разгляду названых матываў у тэкстах паэтаў старэйшага пакалення, якія адмыслова фіксуюць – праз эмоцыю, а не канстатацыю факта – зрухі ў навакольным свеце, пазначаным зменай эпох. Пры гэтым з савецкіх часоў усё яшчэ застаюцца актуальнымі і публіцыстычны пафас, і памкненне да непасрэднай лірычнай споведзі. У рэфлексійна-медытатыўных тэкстах старэйшай генерацыі асноватворным пачуццём становіцца сумненне, а таксама канстатуецца прынцыповая немагчымасць самаспазнання («Жыву, і, дзякуй, не ў прасторы голай…» Р. Баравіковай, «Пра дзіўнае адчуванне» А. Вярцінскага, «Мароз на дварэ» Н. Мацяш, «Пакуль чалавек жыве…», «Спяшаемся, але ўсё роўна…» А. Разанава, «Пачатак» Я. Сіпакова, «Позніцца вясна», «Думаў яшчэ нядаўна» М. Стральцова). Пашыраюцца матывы, характэрныя для лірыкі мадэрнізму, якія дазваляюць лірычным героям наблізіцца да сваёй экзістэнцыі і паспрабаваць знайсці адказы на пытанне пра сэнс наяўнага ўнутранага дыскамфорту («Глухата», «Хачу я з тым, з маленства, хлапчуком...», «З дарогі», «Пад шоргат кропель дажджавых...» М. Стральцова). Развіваюцца матывы адчужанасці, сенсорнага голаду, адзіноты, а таксама супраціў тэатралізацыі і фальшу сённяшняга свету. У творчасці нярэдка рэпрэзентуецца ідэя разгубленасці перад пошукам сэнсу жыцця і ўласнага «Я», канкрэтных адказаў на спрадвечныя пытанні ў паэтаў няма, што можа ўводзіць лірычных герояў у своеасаблівы стан расхістанасці, страты ўнутранай раўнавагі (адсюль пашыраны драматычны пафас).

**У раздзеле 2.3 «Феномен кахання ў мастацкай аксіялогіі паэтаў старэйшага пакалення»** згаданая з’ява як экзістэнцыйная, а не інтымная праблема найперш асэнсоўваецца ў сувязі з такімі катэгорыямі, як смерць, спасціжэнне ўласнага «Я», пошук сэнсу жыцця, пакута, самота, роспач і пад. Часта каханне – як правіла, шчаслівае і ўзаемнае – становіцца той сілай, якая дапамагае лірычным героям пераадолець балансаванне ўласнай экзістэнцыі паміж уладкаванасцю і неўладкаванасцю жыцця, упэўненасцю і няўпэўненасцю ў сабе і свеце. Гэта значыць, глыбокія інтымныя пачуцці ў лірыцы паэтаў старэйшага пакалення становяцца сэнсаўтваральнай асновай быцця чалавека, хоць паралельна ідуць і тэксты са знітаванасцю Эрасу («інстынкту жыцця») і

Танатасу («інстынкту смерці»). Драматычны модус мастацкасці ў паэтаў-паплечнікаў са старэйшага пакалення характэрны пераважна для жаночай любоўнай лірыкі («За дзень да снежня», «Верш без назвы» Р. Баравіковай, «Не ведаю» Н. Мацяш). У падобных выпадках феномен кахання ўвасабляецца праз экзістэнцыйныя матывы пакуты, расчаравання, роспачы, самоты.

Экзістэнцыйны складнік сістэмна, як выразная ўласцівасць светапогляду і ўсвядомленая тэндэнцыя, пазіцыяваны найперш у позняй лірыцы М. Стральцова («У зелянкавых фарбах неба...», «Пейзаж са старадворышчам», «Чаму так згадваем былое...», « За вёскаю, на адзіноце...», «Вада асенняе крыніцы...», «Напэўна, гусі на бяду...», «Бальніца ў полі», інш.). Гэты факт дае падставы лічыць паэзію позняга М. Стральцова максімальна набліжанай да філасофіі экзістэнцыялізму.

<u>**У главе 3**</u> **«Увасабленне экзістэнцыйнай праблематыкі паэтамі сярэдняга пакалення»** разглядаюцца феномен смерці, праблема ўнутранай свабоды і з'явы адзіноты і кахання, рэалізаваныя ў сучаснай лірычнай творчасці І. Бабкова, Г. Дубянецкай, А. Мінкіна, Л. Рублеўскай, Л. Сом, А. Сыса і В. Шніпа.

**У раздзеле 3.1 «Феномен смерці ў кантэксце экзістэнцыйнай праблематыкі ў сучаснай беларускай лірыцы»** адзначаецца, што сітуацыя смерці ў тэкстах паэтаў сярэдняга пакалення часта набывае пазітыўныя канатацыі; адмаўленне страху перад небыццём і сцвярджэнне яго прыцягальнасці найбольш выразна праступае праз адпаведную тропіку і вобразна-выяўленчыя структуры. Скон нярэдка ўспрымаецца менш разбуральным, чым здрада, несвабода, страх, ды і само жыццё («Сцякалі ў сон» Г. Дубянецкай, «Злодзей», «Дзень нараджэння дарогі» Л. Рублеўскай, «Забойства каханых – заўсёдная справа…», «О, як нясцерпна і прагна..» Л. Сом). Звяртае на сябе ўвагу фаталізм паэтаў сярэдняга пакалення. Ён мае адмысловае аблічча – геданістычнае: паколькі пазбегнуць скону немагчыма, ці не лагічней жыць напоўніцу, пакуль маеш такі шанц («У шкляным саркафазе», «Маналог Апанаса Філіповіча» А. Сыса, «Здрада», «Воля на чужыне…» В. Шніпа). Пры гэтым кожны з аўтараў дэманструе ўласныя мастацкія падыходы да рэалізацыі ідэі «пазітыўнага фаталізму». У лірыцы, створанай паэтамі сярэдняга пакалення, цэласны філасофскі дыскурс прасочваецца ў светаразуменні І. Бабкова («Калі восень…», «Усё той жа сон…», «За небакраем Еўропы: у акопах заціхла туга…»), А. Мінкіна («XXVII. Самота», «XXXIV. Валун», «XXXIV. Цераз мрок напрасткі...», «XXXVI. Хмель»), Л. Сом («Я змушаны жыццё цярпець…», «Калі мне стане ўсё адзіна…», «Ах не, жанчына гэтая не з лёду…»). Паэтыка вершаў, у якіх асэнсоўваецца матыў незваротнай страты блізкага чалавека, убірае ў сябе матывы адмаўлення, роспачы, непрыняцця і іншых падобных эмацыйных рэакцый; прасочваецца знітаванасць эратычных і танатычных матываў. Матыў самазабойства фігуруе ў лірыцы прадстаўнікоў сярэдняга пакалення адносна рэдка і мае ці нейтральную семантыку, якая не прадугледжвае ацэначнай пазіцыі, ці нясе негатыўныя канатацыі.

**У раздзеле 3.2 «Унутраная свабода як экзістэнцыйны матыў у мастацка-філасофскім асэнсаванні паэтаў сярэдняга пакалення»** разглядаецца спецыфіка ўвасаблення феномена волі ў аўтарскіх тэкстах – як правіла, на прыкладзе асобнай унікальнай экзістэнцыі. У філасофска-эстэтычнай сістэме паэтаў сярэдняй генерацыі наяўнасць унутранай волі часта выступае неабходнай умовай існавання, хаця цэласнага асэнсавання ці хаця б паэтычнай дэфініцыі ў лірыцы не знаходзіць. Нярэдка свабода асэнсоўваецца мастакамі слова ў цеснай знітаванасці з феноменам смерці («Калі восень…», «Усё той жа сон…» І. Бабкова, «Хто мы», «Забірай» Г. Дубянецкай, «Магілы», «Човен харона. Калі жыццё нашчэнт згалее…» А. Мінкіна, «Максіму», «Злодзей», «Балада пра чорны шоўк і белыя карункі» Л. Рублеўскай, «Я баяўся страціць волю…», «Я змушаны жыццё цярпець…» Л. Сом, «Я дарэшты ў тваёй уладзе…», «Песня пра каханне» А. Сыса, »Балада пра сонца», «Не кажы!..», «Ты ведаеш даўно, што мы памром…» В. Шніпа). Немалаважным з’яўляецца і тое, што свабода ў творах часам уступае ў антанімічныя адносіны з феноменам кахання (прычым такая сувязь часцей асэнсоўваецца, як і ў прадстаўнікоў старэйшага пакалення, паэткамі-жанчынамі). Таксама займае даволі важнае месца традыцыйны матыў супрацьпастаўлення свабоды і залежнасці. Несвабода, такім чынам, знаходзіць сваё метафарычнае азначэнне ў паэтычных тэкстах праз сімвалічныя вобразы шклянога саркафага, ланцугоў, няволі, залатой клеткі, кратаў, палону. Паняцце волі часам карэлюе з катэгорыяй страху: гэта боязь свабоды па прычыне яе неспасціжнасці як феномена; альбо – занепакоенасць асобы магчымасцю страты свабоды ў выпадку выбару кахання.

**У раздзел 3.3 «Каханне і адзінота як экзістэнцыйныя з’явы ў лірыцы сучасных паэтаў сярэдняга пакалення»** адзначаецца, што феномен кахання рэпрэзентуецца ў паэзіі творцаў альбо як найвялікшы дар, альбо як невыносная пакута. Пры гэтым сэнсаўтваральнай асновай жыцця становіцца форма шчырай і сапраўднай любові, безумоўная важнасць якой неаднаразова падкрэсліваецца ў аўтарскіх тэкстах. Часта акцэнт робіцца на самадастатковасці кахання, якое становіцца адказам на адвечнае пытанне сэнсу чалавечага існавання і можа надзяліць чалавека спакоем і ўпэўненасцю ў вартасці жыцця, адцягнуць увагу ад пакутлівых роздумаў пра сэнс свайго існавання і ад страху смерці. Немалаважнае месца ў лірыцы паэтаў сярэдняга пакалення займае цесная знітаванасць матываў адзіноты і кахання, таму што апошняе часта рэпрэзентуецца лірычнымі героямі як недасяжны ідэал. Адзінота ў якасці экзістэнцыйнага матыву ўсведамляецца творцамі сярэдняга пакалення часцей, чым прадстаўнікамі іншых генерацый, і асэнсоўваецца імі як магчымасць самавыяўлення альбо паўстае бытавой, псіхалагічнай ці інтымнай сітуацыяй («Дворык. Па сходах уверх…», «Па-за вокнамі дождж пляце павуцінне сну…», «Углядаючыся ў югэн прамінулага часу» І. Бабкова, «Fatiguee», «Забірай» Г. Дубянецкай, «Балада пра недаступную прыгажосць», «Паўстане з хваляў часу Авалон…» Л. Рублеўскай, «Адзінокая зорка гарыць…», «Навыдумлялася

каханне…», «Суразмоўцы далёка – папера…» Л. Сом, «Выкраданне агню», «Сто гадоў гарадской адзіноты…» В. Шніпа і інш.).

**<u>У главе 4</u> «Экзістэнцыя ў мастацкім асэнсаванні маладых паэтаў»** на прыкладзе паэтычных тэкстаў Ц. Велета, З. Вішнёва, В. Гапеевай, А. Дуброўскага-Сарочанкава, В. Жыбуля, Н. Кудасавай, М. Латышкевіч, В. Морт, А. Рудака, В. Рыжкова, В. Трэнас і іншых разглядаюцца феномены смерці, кахання, а таксама пошук асобай свайго месца ў свеце.

**У раздзеле 4.1 «Смерць як адна з асноўных экзістэнцыйных катэгорый у творчасці пакалення 1980–1990-х гг.»** падкрэсліваецца выключная цікавасць аўтараў малодшай генерацыі да танатычных тэм і іх глыбокае раскрыццё. Смерць у тэкстах прымае розныя формы ўвасаблення, выступаючы ў трох ролях: натуральнае завяршэнне фізічнага існавання, самазабойства і гвалтоўны скон. Назіраецца рэпрэзентацыя спакойнага, нейтральнага (часам нават – да эпатажу абыякавага) стаўлення да ідэі канечнасці чалавечага жыцця. У параўнанні з папярэднікамі маладыя паэты не толькі часцей звяртаюцца да мартальных пытанняў, але і асэнсоўваюць іх праз больш смелыя і нават эпатажныя, наўмысна правакатыўныя вобразы, звяртаюцца да персаніфікацыі скону («што скура нованароджанага дні…», «у цемры ляжу…» Ц. Велета, «1. у гэтым горадзе трэба прыбраць трупы…», «я вязу на пахаванне вянок…» З. Вішнёва, «мне не выкінуць жыцця са слова смерць…», «МНЕ белым кітом…» В. Гапеевай, «Сярод зорных крывадушных шэптаў…», «Мы ідзём па-над хвалямі велічнай часавай плыні…» А. Дуброўскага-Сарочанкава, «Быццам рыбы» В. Жыбуля, «Калі маё жыццё свой шлях завершыць…», «Калі сэрца прасякнутае святлом суіцыду…» Н. Кудасавай, «Ода да Бранкі», «Мара – не быць абароненым…» В. Морт, «так, у дзяды можна трапіць проста…», «Бабуля слухае музыку» А. Рудака, «самае цікавае», «Верш калясамурайскай тэматыкі» В. Рыжкова, «Не тое», «Смак адчаю» В. Трэнас. Лірычныя героі часта безагаворачна прымаюць ідэю/феномен смерці ў сваю экзістэнцыю і спрабуюць знайсці прыжыццёвае супакаенне і існаванне без страху па меры магчымасцей. Маладыя паэты ўпершыню ў беларускім прыгожым пісьменстве пазбавілі статусу выключнасці праблему суіцыду («па небасхіле цёмным караскалася чародка птушак…» Ц. Велета, «вось боўтаюся на вяроўцы…» З. Вішнёва, «Ружовыя галюцынацыі…» В. Гапеевай, «Серыйнае самазабойства», «Ода кланаванню» В. Жыбуля, «Калі сэрца прасякнутае святлом суіцыду…» Н. Кудасавай, «Альберт Эйнштэйн» А. Рудака, «Верш калясамурайскай тэматыкі», «самае цікавае» В. Рыжкова, «Чужынец» В. Трэнас). Гранічнае супрацьстаянне чалавека і соцыуму можа адлюстроўвацца ў вершах праз матыў забойства, сведкам, ахвярай або выканаўцам якога становіцца лірычны герой, што ўвасабляецца з дапамогай паэтыкі постмадэрнізму і поставангардызму. Экзістэнцыйны складнік як трывалая ўласцівасць светапогляду вылучаецца ў лірыцы В. Трэнас («душа бы зламанае ссохлае дрэўца…», «Не тое», «Смак адчаю», «Рэцыдывы самоты») і В. Морт («Зінгер», «Кенатаф»).

**Раздзел 4.2 «Пошук асобай свайго месца ў свеце ў лірыцы малодшай генерацыі»** прысвечаны мастацкай рэалізацыі катэгорый болю, адзіноты і драматычнага ўспрымання рэчаіснасці, актуальнага часу, калі перад лірычнымі героямі востра стаіць пытанне сваёй самаідэнтыфікацыі. Яны часта трапляюць у сітуацыю канфлікту – звычайна гэта супрацьстаянне «Я–Іншыя» ці «Я–Знешні свет», якое так і застаецца нявырашаным. Адсюль выразныя эскапісцкія матывы. Трагедыйна-драматычнае светаўспрыманне маладога пакалення відавочнае, хаця вонкава яно прыкрываецца ўроніяй, падкрэсленай абыякавасцю ці нават агрэсіяй («(мілы той куток, дзе рэзалі пупок)», «над Бетлеемам штосьці гарыць?..» Ц. Велета, «мае думкі ў гэтых мясцінах» З. Вішнёва, «снежня чацвёртага…», «Канцонэ пра трох ільвоў» В. Гапеевай, «Мы ў дзвюх краінах – я і ты…», «Зноў сакавік да лютага лашчыцца…», «Так было не аднойчы…» А. Дуброўскага-Сарочанкава, «Вышывала аркушы вершамі…», «адзіноты затоены віскат…» Н. Кудасавай, «Перакулены горад» М. Латышкевіч, «Не прислоняться!..», «Апошняя яблыня» В. Морт, «Трамвайны шум» А. Рудака, «Сум», «душа бы зламанае ссохлае дрэўца…» В. Трэнас і інш.). У вершах, дзе супрацьстаянне асобы і грамадства становіцца сэнса- і тэкстаўтваральным, нярэдка акцэнтуецца ўвага на выключнасці, унікальнасці, адзінкавасці чалавечай асобы і адстойванні ёю ўласнай індывідуальнасці. Боль звычайна носіць характар не фізічнай, а маральнай ці псіхалагічнай з’явы, пры рэпрэзентацыі якой падлягае эстэтызацыі і рамантызацыі. Матыў адзіноты, як правіла, выкарыстоўваецца дзеля таго, каб узмацніць драматычны пафас лірыкі, стварыць адпаведны драматычнаму светаўспрыманню фон. Падкрэсліваецца распрацаванасць тэмы экзістэнцыі ў тэкстуальнай прасторы горада і – значна радзей – вёскі. Урбаністычны пейзаж становіцца альбо фонам для выражэння перажыванняў і эмацыянальнага стану, альбо адбіткам акалічнасцей унутранага свету.

**У раздзеле 4.3 «Спецыфіка рэалізацыі феномена кахання»** зазначаецца, што паэтыка інтэлектуальнай і інтымнай лірыкі маладых аўтараў, звязаных са згаданай з’явай, як правіла, вылучаецца дамінаваннем выразнага драматычнага пафасу, таму эсхаталагічныя матывы тут дамінуюць над віталісцкімі, іронія і правакацыя ідуць поруч са шчырасцю і лірычнай спавядальнасцю («Спартовая трампланаманія», «(садысцкія сны)», «Пацука мама на ганак шама» З. Вішнёва, «нібы я наўмысна імкнуся да адзіноты…» В. Гапеевай, «Дзённік Максіма Багдановіча», «Я хачу паварушыць тваім хвастом…» В. Жыбуля, «Багіня» Н. Кудасавай, «Беражы мяне, беражы…» В. Морт, «дарожныя здарэнні», «Балада непадзельнага» В. Рыжкова, «Замова» В. Трэнас, інш.). Адметна, што героі паэзіі маладых творцаў максімальна засяроджаны на сабе ў праявах закаханасці. Каханне як феномен у сучасным соцыуме становіцца пэўным выклікам варожаму знешняму свету, «памежнаму» часу, калі для маладога лірычнага суб’екта не застаецца нічога вартага навокал, акрамя любові.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

Экзістэнцыйная праблематыка, якая ўключае ўсё, што звязана з канкрэтным быццём – пошук сэнсу жыцця, смерць, страх, адзіноту як праявы драматычнага светаўспрымання, феномены свабоды, кахання, спасціжэнне ўласнага «Я» і інш., вылучаецца сваёй універсальнасцю і выяўляецца ў творчым, сублімацыйным акце праз вобразнае мысленне. Разам з тым на кожным этапе гістарычнага развіцця праявы «быційнага» мыслення ў мастацкім тэксце мелі розную спецыфіку ўвасаблення. У ХХ стагоддзі, насычаным катастрофамі, пытанні чалавечага існавання аформіліся ў адзінае праблемнае поле экзістэнцыйнай свядомасці. Гэта рэзка наблізіла лірыку на постсавецкай прасторы да пастулатаў філасофіі экзістэнцыялізму. Пашырылася мастацкае адлюстраванне жыццёвай плыні ў вобразах з экзістэнцыйнымі канатацыямі. У ходзе даследавання пацвердзілася гіпотэза пра тое, што вобразнасць з экзістэнцыйнай скіраванасцю будзе спецыфічна-адметнай у паэтаў, якія храналагічна з'яўляюцца паплечнікамі, але належаць да розных пакаленняў, што пачыналі пісаць у розных умовах: у савецкую эпоху, у час фарміравання новай дзяржаўнасці ў Рэспубліцы Беларусь, на пачатку ХХІ ст. У выніку праведзенага даследавання мы прыйшлі да наступных высноў:

1. Матывы з экзістэнцыйнымі канатацыямі вылучаюцца на памежжы мастацкай вобразнасці і філасофіі экзістэнцыялізму. Лірыка з *інтэлектуальнай рэфлексіяй* аўтарства сучасных беларускіх паэтаў у рознай ступені набліжана да тых пастулатаў, што сцверджаны філасофіяй экзістэнцыялізму. Пры гэтым аўтары вершаў на самыя адметныя тэмы, у якіх ёсць зварот да цяжкавырашальных праблем чалавечага існавання (экзістэнцыі), тым самым актуалізуюць матывы з *экзістэнцыйнымі канатацыямі*. Спецыфіка вобразнага ўвасаблення матываў з экзістэнцыйнымі канатацыямі (пошуку сэнсу быцця, рэінкарнацыі, знітаванасці жыцця і смерці, кахання як асновы быцця, расчаравання, самоты, унутранага дыскамфорту, самазабойства, сувязі свабоды са страхам, эмацыйнага эскапізму, выключнасці і інш.) істотна адрозніваецца ў творчасці трох паэтычных пакаленняў беларускіх аўтараў, актыўных у перыяд пераходу з ХХ у ХХІ стст. Прадстаўнікі розных генерацый не супадаюць як у адборы праблем, якім надаецца больш мастацкай увагі, так і ў спосабах іх увасаблення. Старэйшая генерацыя аўтараў прадстаўляе найбольш традыцыйны падыход да асэнсавання ўласнай экзістэнцыі. Тут пераасэнсоўваюцца язычніцкія табу і хрысціянскія, будысцкія, даоскія (праз матывы рэінкарнацыі) каштоўнасці, дамінуюць вітальнасць і гуманізм, праблема асабістага самаспасціжэння не драматызуецца да памежных псіхалагічных станаў. Выяўляецца і спецыфічны дыдактызм як праява паэтыкі сацыялістычнага рэалізму. Сярэдняе пакаленне дэманструе асаблівую цікавасць да праблемы ўнутранай свабоды, а пошук сэнсу жыцця і свайго месца ў свеце падмяняецца канцэпцыяй «геданістычнага фаталізму». Маладзейшыя паэты, што збольшага

былі пачаткоўцамі ў 1990-я гг., часцей прадстаюць эксперыментатарамі ў сваіх вершах. У іх лірыцы назіраецца зліццё драматычнага пафасу, выклiканага невырашальнасцю канфлікту «Я–Соцыум», з частымі прыёмамі іроніі, эпатажу. У вершах маладзейшых паэтаў вобразнасць постмадэрнісцкага, поставангардысцкага кшталту пераважае над традыцыйным адлюстраваннем жыцця, якое паказвалася ў ідыястылях пераважна рэалістычнай або рамантычнай, а таксама мадэрнісцкай скіраванасці [2; 4; 5; 10–12; 14–18; 24–25].

2. Усе тры дзейсныя на мяжы XX – XXI стст. генерацыі сучасных паэтаў асэнсоўваюць праблему смерці альбо як дадзенасць, альбо праз адмаўленне і ірацыянальны страх перад сконам (невядомасцю). Старэйшае пакаленне арыентуецца на шлях прыняцця смерці праз вопыт уласнага асэнсавання маральнай, гуманістычнай нормы, што нярэдка выказваецца ў дыдактычнай манеры; смерць мысліцца толькі ў сувязі з жыццём як важнейшай каштоўнасцю. Вітальнасць, жыццесцвярджальны пафас аказваюцца дамінантнымі ў лірыцы Р. Баравіковай, А. Вярцінскага, Н. Мацяш, А. Разанава, Я. Сіпакова. Адметнымі рысамі ў лірыцы старэйшай генерацыі з’яўляецца наяўнасць антымілітарысцкіх матываў, а таксама пазбяганне самой лексемы «смерць» – зварот да перыфраз-эўфемізмаў.

Канцэпцыя фаталізму, які можна ахарактарызаваць як «геданістычны», вызначае трактоўку праблемы скону ў пераважнай большасці паэтаў-»васьмідзясятнікаў». Як вынік, смерць у іх творчасці нярэдка набывае пазітыўныя канатацыі, успрымаецца менш разбуральнай, чым здрада, страх ці само чалавечае існаванне, а карэляцыя «жыццё – смерць» губляе сваю антытэтычную сутнасць, замяняючыся каўзуальнай сувяззю ў вершах І. Бабкова, Г. Дубянецкай, А. Мінкіна, Л. Рублеўскай, Л. Сом, А. Сыса, В. Шніпа. Свой трагізм скон захоўвае толькі ў вершах пра незваротную страту блізкага чалавека.

Паэты «трэцяга пакалення», якія пачыналі пісаць у 1990-я гг., значна часцей за старэйшых паплечнікаў звяртаюцца да праблемы смерці, дэманструючы пры гэтым падкрэслена абыякавую рэакцыю, адсутнасць страху і нават эпатаж у дачыненні да фактаў скону (тэксты З. Вішнёва, В. Гапеевай, А. Дуброўскага-Сарочанкава, В. Жыбуля, Н. Кудасавай, В. Морт, А. Рудака, В. Рыжкова, В. Трэнас). Для іх паэзіі характэрна пазбаўленне смерці містычнага арэолу праз яе эстэтызацыю ці іронію. Менавіта гэтае пакаленне ўпершыню ў беларускім прыгожым пісьменстве вывела на новы ўзровень мастацкага асэнсавання тэму суіцыду: праз агучванне, прыняцце і пражыванне лірычнымі персанажамі шырокага спектру эмоцый, датычных самагубства [1; 3–4; 6–9; 12–14; 25].

3. Асэнсоўваючы сучасную рэчаіснасць і соцыум, паэты ўсіх трох пакаленняў паслядоўна дэманструюць блізкую да поглядаў экзістэнцыялістаў ідэю адзіноты чалавека ў варожым свеце праз матывы яго тэатралізацыі, фальшу, гульні і пад. Адпаведна вершы, прысвечаныя праблеме пошуку

ўласнага сэнсу жыцця, вылучаюцца драматычным модусам мастацкасці. Аднак у рэфлексійна-медытатыўных тэкстах старэйшай генерацыі асноватворным пачуццём становіцца сумненне, а таксама канстатуецца прынцыповая немагчымасць самаспазнання. Сярэдняе пакаленне не праяўляе падкрэсленай цікавасці да пошуку свайго «Я» ў варожым свеце: «васьмідзясятнікаў» значна больш прыцягвае вырашэнне праблемы ўнутранай свабоды. Яна, у сваю чаргу, часта знітавана з таямніцай смерці і страхам (прычым бояззю як страты волі, так і яе набыцця), звыкла супрацьпастаўлена залежнасці і не набывае глыбокага філасофскага і завершанага вызначэння ў тэкстах, застаючыся неспасціжным феноменам. Адметна, што ўнутраная свабода ў вершах старэйшага і малодшага пакаленняў не адасабляецца як самастойная складаная тэма. Сучасныя аўтары «трэцяга пакалення» асэнсоўваюць экзістэнцыйныя праблемы спасціжэння сябе і навакольнага свету праз канфліктнае супрацьстаянне «Я–Соцыум», якое вылучаецца сваёй катэгарычнасцю і невырашальнасцю на фоне вопыту папярэднікаў. Адсюль такія абарончыя рэакцыі, як скепсіс і іронія, агрэсія, эскапізм, культываванне і эстэтызацыя болю, пакутаў і адзіноты, за чым угадваецца трагедыйна-драматычнае светаўспрыманне, характэрнае для героя-максімаліста [1–5; 7–9; 11; 13; 24].

4. Адно з галоўных месцаў у мастацкай аксіялогіі ўсіх генерацый сучасных паэтаў займае пачуццё кахання. Як правіла, спецыфіка вобразнасці з канатацыямі інтымных пачуццяў вынікае з эратычна-танатычнай прыроды любові, а таму яна можа стаць як жыццеўтваральнай асновай, сродкам пераадолення неўладкаванасці ўласнай экзістэнцыі, так і разбуральнай сілай, крыніцай горычы, пакуты і адзіноты. Апошняя ў паэзіі сярэдняга пакалення асэнсоўваецца часцей, чым прадстаўнікамі іншых генерацый, і інтэрпрэтуецца як магчымасць самавыяўлення альбо паўстае бытавой, псіхалагічнай ці інтымнай сітуацыяй. Падкрэслім, што калі драматычны пафас у паэтаў-паплечнікаў са старэйшага і сярэдняга пакаленняў характэрны пераважна для жаночай любоўнай лірыкі, то ў маладзейшай генерацыі прыхільнасць да такой мадальнасці ўласцівая і мужчынам у значнай ступені. Іх лірычныя героі перажываюць цэлы спектр такіх пачуццяў, як страх, рэўнасць, адзінота, пакуты і падобнае. Віталісцкі пачатак тут нярэдка саступае мартальнаму, вершы набываюць гранічную эгацэнтрычнасць, арыгінальнасць вобразнасці мяжуе з эпатажам (вершы В. Жыбуля, А. Рудака, В. Рыжкова) [4; 6; 9–10; 15; 20–23].

5. Для вывучэння і сістэматызацыі праяў мастацкай рэфлексіі беларускіх паэтаў паводле анталагічных тэм найбольш запатрабаванымі зрабіліся наступныя паняцці: быццё, экзістэнцыя, філасофія экзістэнцыялізму, матыў, канатацыя, мадальнасць, рэфлексія, сублімацыя, лірыка, ідыястыль, дыскурс, светапоглядная мадэль, структура літаратурнага працэсу, паэтычная генерацыя. Беларуская лірыка, у якой асэнсоўваецца чалавечае існаванне ў пераходны, «памежны» перыяд з канца XX у пачатак XXI стст., утварае адзінае праблемнае поле экзістэнцыйнай свядомасці сучасніка-еўрапейца. Палілог беларускіх паэтаў з розных генерацый пацвярджае інтэлектуальную насычанасць і

варыянтнасць эмацыйных інтэнцый у распрацоўцы экзістэнцыйнай праблематыкі. Тэкставы аналіз пацвярджае, што экзістэнцыйны складнік сістэмна, як выразная ўласцівасць светапогляду і ўсвядомленая тэндэнцыя, пазіцыяваны ў лірыцы асобных паэтаў старэйшага і сярэдняга пакалення. Дзякуючы гэтаму ў лірыцы такіх аўтараў прасочваецца цэласны філасофскі дыскурс. Гэта творчасць М. Стральцова, І. Бабкова, А. Мінкіна, Л. Сом, В. Трэнас, В. Морт. Разам з тым большасць беларускіх паэтаў выяўляюць дастаткова збалансаваны светапогляд, у якім апеляцыя да філасофіі экзістэнцыялізму або да экзістэнцыйнага светаадчування фіксуецца толькі на ўзроўні асобных матываў і вобразаў з адпаведнымі канатацыямі. Ва ўсёй сваёй сукупнасці лірыка з драматычнай мадальнасцю стала рэпрэзентуе Беларусь у яе інтэлектуальна-мастацкай іпастасі сярод аналагічных культурных з’яў з універсальнага міжнароднага кантэксту [1; 3–4; 7–18; 22; 24–25].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць выкарыстоўвацца ў навучальным працэсе пры стварэнні вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных факультэтаў; пры падрыхтоўцы лекцыйных курсаў па беларускай літаратуры канца ХХ – пачатку ХХІ стст. ва ўстановах вышэйшай адукацыі; у самастойнай навуковай працы студэнтаў, а таксама ў працы настаўнікаў беларускай літаратуры пры падрыхтоўцы вучняў да профільных алімпіяд. Вынікі таксама могуць выкарыстоўвацца для стварэння практычных рэкамендацый і прапаноў па вылучэнні перспектыўных кірункаў у далейшым вывучэнні экзістэнцыйнай праблематыкі ў паэзіі для аператыўнага ўключэння набыткаў беларускай культуры ў больш шырокі еўрапейскі кантэкст.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

## Артыкулы ў навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК

1. Анцімонік, А. Экзістэнцыйныя праблемы ў лірыцы Я. Сіпакова / А. Анцімонік // Роднае слова. – 2016. – №1. – С. 20–21.

2. Анцімонік, А. Лірычны суб'ект сучаснага верша праз прызму асэнсавання ўласнай экзістэнцыі / А. Анцімонік // Роднае слова. – 2017. – №7. – С. 17–19.

3. Анцімонік, А. Экзістэнцыйныя аспекты ў паэзіі Алега Мінкіна / А. Анцімонік // Роднае слова. – 2021. – №2. – С. 27–29.

4. Анцімонік А.В. Мастацкая вобразнасць з экзістэнцыйнымі канатацыямі ў беларускай лірыцы мяжы ХХ – ХХІ стст. / А. В. Анцімонік // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия A. Гуманитарные науки. — Новополоцк, 2021. — № 10. — С. 2–7.

## Артыкулы ў часопісах і зборніках навуковых прац

5. Анцімонік, А. Экзістэнцыйны канфлікт у лірычных тэкстах сучасных маладых беларускіх паэтаў / А. Анцімонік // Спадчына І. Я. Навуменкі і актуальныя праблемы літаратуразнаўства : зборнік навуковых артыкулаў / рэдкал. І. Ф. Штэйнер (гал. рэд.) [і інш.] М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны ўн-т імя Ф. Скарыны. - Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2014. – С. 52–55.

6. Анцімонік, А. Асаблівасці адлюстравання матываў кахання і смерці ў лірыцы Вікі Трэнас / А. Анцімонік // Актуальные проблемы филологии : сб. науч. статей. Вып. 7 / редкол. А. В. Бредихина (гл. ред.) [и др.]; М-во образования РБ, Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2014. – С. 3–6.

7. Анцімонік, А. Адметнасць увасаблення экзістэнцыйных матываў у творчасці А. Хадановіча / А. Анцімонік // Актуальные проблемы филологии : сб. науч. статей. Вып. 8 / редкол. А. В. Бредихина (гл. ред.) [и др.]; М-во образования РБ, Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2015. – С. 3–7.

8. Анцімонік, А. Спосабы рэалізацыі экзістэнцыйных праблем у творчасці В. Жыбуля і Зм. Вішнёва / А. Анцімонік // Творчество молодых'2015 : сб. науч. работ студентов и аспирантов УО «ГГУ им. Ф. Скорины» : в 3 ч. Ч. 3 / О. М. Демиденко (гл. ред.); редкол.: Р. В. Бородич [и др.]; М-во образования РБ, Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2015. – С. 8–12.

9. Анцімонік, А. Асноўныя экзістэнцыйныя матывы ў лірыцы Л. Сом / А. Анцімонік // Скарынаўскія традыцыі : гісторыя і сучаснасць: зборнік

навуковых артыкулаў: у 2 ч. Ч. 2 / рэдкал. А. М. Ермакова (гл. рэд.) [і інш.]; М-ва адукацыі РБ, Гом. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны, 2015. – С. 119–124.

10. Анцімонік, А. Адзінота і каханне як экзістэнцыйныя з'явы ў лірыцы сучасных паэтаў сярэдняга пакалення / А. Анцімонік // Актуальные проблемы филологии : сб. науч. статей. Вып. 9 / редкол. А. В. Бредихина (гл. ред.) [и др.]; М-во образования РБ, Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2016. – С. 3–8.

11. Анцімонік, А. Мастацкае асэнсаванне ўнутранай свабоды як экзістэнцыйнай праблемы ў сучаснай лірыцы / А. Анцімонік // Творчество молодых'2016 : сб. науч. работ студентов и аспирантов УО «ГГУ им. Ф. Скорины» : в 4 ч. Ч. 3 / О. М. Демиденко (гл. ред.); редкол.: Р. В. Бородич [и др.]; М-во образования РБ, Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2016. – С. 9–13.

12. Анцімонік, А. Феномен смерці ў кантэксце экзістэнцыйнай праблематыкі сучаснай беларускай лірыкі / А. Анцімонік // Чарнобылем не зарасце: традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся : зборнік навуковых артыкулаў : у 2 ч. Ч. 2 / рэдкал. : А. А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.] ; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2016. – С. 89–94.

13. Анцімонік, А. Спецыфіка вырашэння экзістэнцыйных праблем у лірыцы А. Вярцінскага / А. Анцімонік // Спадчына І. Я. Навуменкі і актуальныя праблемы літаратуразнаўства / І. Ф. Штэйнер; М-ва адукацыі РБ, Гом. дзярж. ўн-т імя Францыска Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2016. – С. 167–171.

14. Анцімонік, А. Смерць як адна з асноўных экзістэнцыйных катэгорый у лірыцы маладога пакалення / А. Анцімонік // Актуальные проблемы филологии : сб. науч. статей. Вып.10 / редкол. А. В. Бредихина (гл. ред.) [и др.]; М-во образования РБ, Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2017. – С. 6–11.

15. Анцімонік, А. Феномен кахання як экзістэнцыйная праблема ў лірыцы сучасных паэтаў старэйшага пакалення / А. Анцімонік // Творчество молодых 2017 : сб. науч. работ студентов и аспирантов УО «ГГУ им. Ф. Скорины» : в 4 ч. Ч. 3 / О. М. Демиденко (гл. ред.); редкол.: Р. В. Бородич [и др.]; М-во образования РБ, Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2017. – С. 10–14.

16. Анцімонік, А. Праблема пошуку сэнсу жыцця ў творчасці сучасных беларускіх паэтаў старэйшага пакалення / А. Анцімонік // Христианский гуманизм и его традиции в славянской культуре [Текст] : сборник научных статей. Вып 11. / редкол.: Н. В.Суслова (гл. ред.) [и др.]; М-во образования РБ, Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2017. – С. 8–11.

17. Анцімонік, А., Брадзіхіна, А. Спецыфіка вырашэння экзістэнцыйных праблем у беларускай лірыцы мяжы тысячагоддзяў / А. Анцімонік,

А. Брадзіхіна // Сборник статей лауреатов и авторов научных работ, получивших первую категорию, «НИРС 2017». – Минск, 2018. – С. 414.

18. Анцімонік, А. Чалавечая экзістэнцыя ў тэкстуальнай прасторы горада і вёскі: паэзія Вальжыны Морт і Юлі Цімафеевай / А. Анцімонік // Проблеми сучасного літературознавства : Збірник наукових праць / Відп. ред. Є. М. Черноіваненко. – Одеса : Астропринт, 2019. – Вип. 29. – С. 63–71.

## Матэрыялы навуковых канферэнцый

19. Анцімонік, А. Спосабы мастацкага ўвасаблення лірычнага героя ў творчасці Вікі Трэнас / А. Анцімонік // «Дни студенческой науки», XLIII студ. науч.-практ. конф. (2014; Гомель). XLIII студенческая научно-практическая конференция «Дни студенческой науки», 24–25 апреля 2014 г. : [материалы] : в 2 ч. Ч. 2 / редкол.: О. М. Демиденко (гл. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2014. – С. 73.

20. Анцімонік, А. Спецыфіка вобразнай сістэмы ў лірыцы Вікі Трэнас / А. Анцімонік // VIII Машеровские чтения : материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 16 – 17 октября 2014 г. / Вит. гос. ун-т ; редкол.: И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : УО «ВГУ имени П.М. Машерова», 2014. – С. 136.

21. Анцімонік, А. Вобразна-выяўленчыя сродкі ў паэзіі В. Трэнас / А. Анцімонік // Идеи. Поиски. Решения : сборник статей и тезисов XI Международной научно-практической конференции преподавателей, аспирантов, магистрантов, студентов, Минск, 22 ноября 2017 г. В 7 ч. Ч. 6 / БГУ, Филологический фак., Каф. английского языкознания; редкол.: Н. Н. Нижнева (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2018. – С. 11–15.

22. Анцімонік, А. Асноўныя аспекты рэалізацыі феномена кахання як праявы экзістэнцыі ў паэзіі маладой генерацыі сучаснай беларускай літаратуры / А. Анцімонік // Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання : матэрыялы V Рэсп. навук.-практ. канф. маладых навукоўцаў (Мінск, 22 сак. 2019 г.) / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В. У. Зуева (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2019. — С. 39–43.

23. Анцімонік, А. Лірычны герой у творчасці Вікі Трэнас / А. Анцімонік // Мова і літаратура : матэрыялы 76-й навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў філалагічнага факультэта БДУ, Мінск, 24 красавіка 2019 г. / БДУ, Філалагічны фак. ; [пад рэд. К. А. Тананушкі]. – Мінск : БДУ, 2019. – С. 11–14.

24. Анцімонік, А. Экзістэнцыя чалавека ў кантэксце хранатопу ў паэтычных тэкстах маладых беларускіх аўтараў / А. Анцімонік // 77-я научная конференция студентов и аспирантов Белорусского государственного университета [Электронный ресурс] : материалы конф. В 3 ч. Ч. 2, Минск, 11–22 мая 2020 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: В. Г. Сафонов (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2020. – С. 10–13.

25. Анцімонік, А. Рэалізацыя мастацкай апазіцыі «жыццё – смерць» у паэзіі сучасных творцаў старэйшага пакалення / А. Анцімонік // Мова і літаратура : матэрыялы 78-й навук. канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў філалагічнага фак. БДУ, Мінск, 22 красавіка 2021 г. / БДУ, Філалагічны фак. ; [рэд. калегія Г. У. Навумавай (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : БДУ, 2021. – С. 3–6.

# РЭЗЮМЭ

Анцімонік Анастасія Віктараўна

## Беларуская паэзія канца ХХ – пачатку XXI стст.: мастацкае ўвасабленне экзістэнцыйнай праблематыкі

**Ключавыя словы**: беларуская лірыка, экзістэнцыя, філасофія экзістэнцыялізму, матыў, канатацыя, мадальнасць, рэфлексія, ідыястыль, светапогляд, паэтычная генерацыя.

**Мэта даследавання**: вызначыць мастацкія падыходы да рэалізацыі экзістэнцыйных праблем у паэзіі значных і адрозных па ідыястылях творцаў, актыўных на мяжы ХХ – XXI стст. (з 1990-х па 2020-я гг.), з трох пакаленняў: старэйшага (Р. Баравікова, А. Вярцінскі, Н. Мацяш, А. Разанаў, Я. Сіпакоў, М. Стральцоў); сярэдняга (І. Бабкоў, Г. Дубянецкая, А. Мінкін, Л. Рублеўская, Л. Сом, А. Сыс, В. Шніп); маладзейшага (Ц. Велет, З. Вішнёў, В. Гапеева, А. Дуброўскі-Сарочанкаў, В. Жыбуль, Н. Кудасава, М. Латышкевіч, В. Морт, А. Рудак, В. Рыжкоў, В. Трэнас), і на гэтай падставе рэканструяваць светаадчуванне і светапоглядныя арыенціры беларуса-інтэлектуала ў постсавецкі час.

**Метады даследавання**: культурна-гістарычны і semiятычны метады, прыёмы цэласнага аналізу мастацкага тэксту.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** У дадзеным даследаванні **упершыню** ў беларускім літаратуразнаўстве распрацавана тэарэтычная аснова для вылучэння і аналізу праблем з экзістэнцыйнай прыродай у рэпрэзентатыўных тэкстах сучаснай беларускай лірыкі; рэканструявана рознавектарнасць экзістэнцыйнага светаадчування ў паэтычным сегменце нацыянальнага літаратурнага працэсу на мяжы ХХ – XXI стст.; дэталёва ўзноўлены і ахарактарызаваны вобразны палілог паэтаў з адрозным быційным вопытам, раскрыты суадносіны ў экзістэнцыйным полі творцаў-паплечнікаў, якія належаць да розных генерацый і спецыфчна раскрываюць аналагічныя праблемы жыцця, смерці, любові, выбару і падобн. Паэзія даследаваных аўтараў у такім ракурсе ў беларускім літаратуразнаўстве паслядоўна сістэматызавана і цэласна ацэнена ўпершыню.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца ў навучальным працэсе ва ўстановах вышэйшай адукацыі; пры падрыхтоўцы вучняў школ да профільных алімпіяд; забяспечваюць уключэнне набыткаў беларускай паэзіі ў навуковыя працы па экзістэнцыйнай праблематыцы ў мастацтве, у тым ліку – у кампаратыўных даследаваннях літаратур замежных краін з аналагічнай філасофскай скіраванасцю.

# РЕЗЮМЕ

Антимоник Анастасия Викторовна

**Белорусская поэзия конца XX – начала XXI вв.: художественное воплощение экзистенциальной проблематики**

**Ключевые слова:** белорусская лирика, экзистенция, философия экзистенциализма, мотив, коннотация, модальность, рефлексия, идиостиль, мировоззрение, поэтическая генерация.

**Цель исследования:** определить художественные подходы к реализации экзистенциальных проблем в поэзии значимых и отличающихся по идиостилям творцов, активных на рубеже XX – XXI вв. (с конца 1980-х по 2010-е гг.), из трёх поколений: старшего (Р. Боровикова, А. Вертинский, Н. Матяш, А. Рязанов, Я. Сипаков, М. Стрельцов); среднего (И. Бобков, Г. Дубенецкая, О. Минкин, Л. Рублевская, Л. Сом, А. Сыс, В. Шнип); младшего (Ц. Велет, З. Вишнев, О. Гапеева, А. Дубровский-Сороченков, В. Жибуль, Н. Кудасова, М. Латышкевич, В. Морт, А. Рудак, В. Рыжков, В. Тренас), и на этом основании реконструировать мироощущение и мировоззренческие ориентиры белоруса-интеллектуала в постсоветское время.

**Методы исследования:** культурно-исторический и семиотический методы, приемы целостного анализа художественного текста.

**Полученные результаты и их новизна.** В данном исследовании **впервые** в белорусском литературоведении разработана теоретическая основа для выделения и анализа проблем с экзистенциальной природой в репрезентативных текстах современной белорусской лирики; реконструирована разновекторность экзистенциального мироощущения в поэтическом сегменте национального литературного процесса на рубеже XX – XXI вв.; детально воссоздан и охарактеризован образный полилог поэтов с отличающимся бытийным опытом, раскрыто соотношение в экзистенциальном поле творцов-соратников, принадлежащих к различным генерациям и специфически раскрывающих аналогичные проблемы жизни, смерти, любви, выбора и под. Поэзия исследованных авторов в таком ракурсе в белорусском литературоведении последовательно систематизирована и целостно оценена впервые.

**Рекомендации по использованию полученных результатов.** Результаты исследования могут использоваться в учебном процессе в учреждениях высшего образования; при подготовке учащихся школ к профильным олимпиадам; обеспечивают включение приобретений белорусской поэзии в научные труды по экзистенциальной проблематике в искусстве, в том числе – в компаративных исследованиях литератур зарубежных стран с аналогичной философской направленностью.

# RESUME

Antsimonik Anastasiya Viktorovna

**Belarusian poetry of the late XX – early XXI centuries: artistic embodiment of existential issues**

**Keywords:** Belarusian lyrics, existence, philosophy of existentialism, motive, connotation, modality, reflection, idiostyle, worldview, poetic generation.

**The purpose of the study:** to identify artistic approaches to the realization of existential problems in the poetry of distinctive and idiosyncratic creators who are active at the turn of the XX – XXI centuries (from the late 1980s to the 2010s), from three generations: the elder (R. Baravikova, A. Viarcinski, N. Maciash, A. Razanau, Ja. Sipakou, M. Stralcou); the middle (I. Babkou, H. Dubianieckaja, A. Minkin, L. Rublieuskaja, L. Som, A. Sys, V. Shnip); the younger (C. Vieliet, Z. Vishniou, V. Hapiejeva, A. Dubrouski-Sarochankau, V. Zhybul, N. Kudasava, M. Latyshkievich, V. Mort, A. Rudak, V. Ryzhkou, V. Trenas), to reconstruct on this basis the attitude and ideological guidelines of the Belarusian intellectual in the post-Soviet period.

**Research methods:** cultural-historical and semiotic methods, techniques of holistic analysis of a literary text.

**The results obtained and their novelty.** In this study, **for the first time** in Belarusian literary studies, a theoretical basis has been developed for the identification and analysis of problems with existential nature in representative texts of modern Belarusian lyrics; the multi–vector nature of existential worldview in the poetic segment of the national literary process at the turn of the XX – XXI centuries has been reconstructed.; the imaginative polylogue of poets with different existential experience is recreated and characterized in detail, the correlation in the existential field of the creators-associates belonging to different generations and specifically revealing similar problems of life, death, love, choice and under is revealed. The poetry of the authors studied in this perspective in Belarusian literary studies is consistently systematized and holistically evaluated for the first time.

**Recommendations for the use of the results obtained.** The results of the research can be used in the educational process at universities; in preparing school students for specialized olympiads; ensure the inclusion of acquisitions of Belarusian poetry in scientific works on existential issues in art, including in comparative studies of literature of foreign countries with a similar philosophical orientation.